УДК 908 (476.7)

# ЖЫЦЦЁВЫ ЛЁС СІДАРА ПАЎЛЮКАЎЦА

***Т.Э. Гмір**, 10 “Б” клас*
*Навуковы кіраўнік – **М.В. Цуба**, к.г.н., дацэнт*
***Палескі дзяржаўны ўніверсітэт***
***Ліцэй УА “Палескі дзяржаўны ўніверсітэт”***

Сідар Іванавіч Паўлюкавец нарадзіўся ў 1884 г. у вёсцы Махро (сёння Іванаўскі раён) у беднай сялянскай сям’і. Аб тым, як расплі і гадаваліся сялянскія дзеці, жывучы сярод лясоў і балот, напісана нямала. Але акрамя традыцыйнага збору грыбоў і ягад ва ўсе часы на Палессі існаваў своеасаблівы промысел – гэта лоўля ўюноў. Звычайна пад вываратамі дрэў утвараліся глыбокія ямы, напоўненыя балотнай вадой, якія поўнасцю не высыхалі нават падчас ліпеньскай жары. Менавіта ў іх вадзіліся карасі, шчупакі і ў вялікай колькасці ўюны. Лоўляй дадзенай рыбы, як правіла, займаліся хлопцы-падросткі. Бывала ў самыя цяжкія бясхлебныя перыяды пранырлівыя хлапчукі зачастую кармілі ўсю сваю сям’ю гэтым паляшуцкім дэлікатэсам. Акрамя таго, яны вымушаны былі пасцігаць і вывучаць усю прамудрасць балоцістых мясцін, якія не давалі магчымасці расслабіцца і не даравалі памылак. Усе гэтыя навыкі ў будучым у поўнай ступені спатрэбяцца Сідару Паўлюкаўцу.

У 1904 г. пачалася расійска-японская вайна. Сідар Паўлюкавец адным з першых у сваёй мясцовасці падпісаў заяву на вайсковую службу. Да таго ж, гэта была ці не адзіная магчымасць кемліваму, незвычайна смеламу, простаму, вясковаму хлопцу з палескай глухамані “выбіцца” ў людзі.

Згодна з успамінамі вядомага расійскага генерала Аляксея Ігнацьева, Сідар Паўлюкавец спачатку служыў у эскадроне ў князя Енгалычава. Але ў хуткім часе быў забраны ім у Енгалычава ў якасці пасыльнага. У гэты перыяд (1904 г.) А.А. Ігнацьеў з’яўляўся палкоўнікам Генштаба царскай арміі і нёс службу разам з С.І. Паўлюкаўцом у прыгарадзе Пецярбурга – Пецяргофе. Даведаўшыся, што Ігнацьева накіроўваюць ў Маньчжурыю, Паўлюкавец папрасіўся ехаць з ім. У будучым вядомы генерал Сідара Паўлюкаўца характарызуе так: “Паўлюкавец, ці як мы яго назы-

Репозиторий ПолесГУ

валі, Паўлюк … так умаляў узяць яго з сабой на вайну, што я не змог яму адказаць. Гэта быў беларус з беднай сялянскай сям'і, чалавек вельмі пануры ад прыроды… Але Паўлюкавец хацеў стаць ліхім афіцэрам, шукаў славы, марыў атрымаць Георгія" [1, с. 3].

Такім чынам, Сідар Паўлюкавец у сярэдзіне жніўня 1904 года аказваецца на тэатры ваенных дзеянняў расійска-японскай вайны пад Ляоянам (тэрыторыя сучаснага Кітая), увайшоўшы ў адно з фарміраванняў 152-тысячнай арміі пад камандваннем генерала А. Курапаткіна. Менавіта пад Ляоянам з 24 жніўня па 3 верасня 1904 года праводзіліся абарончыя баі супраць японскіх войск маршала Аямы. Японцы планавалі ў ходзе наступлення абыйсці з флангаў расійскую армію і разграміць яе. Дзякуючы мужнасці расійскіх салдат і некаторых афіцэраў, 1-я і 2-я японскія арміі былі не толькі астаноўлены, але, панёсшы вялікія страты, адкінуты назад ў ісходнае становішча [2, с. 240, 241]. За баі пад Ляоянам Сідар Паўлюкавец атрымаў сваю першую ўзнагароду.

У сакавіку 1905 года ў бітве пад Мукдэнам ён узнагароджваецца яшчэ двумя георгіеўскімі крыжамі і атрымоўвае афіцэрскае званне прапаршчыка. Пры чым усе тры георгіеўскія крыжы Паўлюкаўцом былі атрыманы за асабістую адвагу ў баях [3, с. 100].

Не проста дасталіся ўзнагароды Сідару Паўлюкаўцу: працяглы пасляваенны час ён залечваў у шпіталі раны, атрыманыя на вайне.

А затым са статусам афіцэра запасу дабраўся да сваіх родных мясцін. Сідара Паўлюкаўца вітала ўся вёска. Тут было ўсё: і слёзы радасці, і шчаслівыя сустрэчы са сваякамі, і вясёлыя застоллі. Па сведчанню аднавяскоўцаў, прыкладна ў 1912 годзе ён пабраўся ў шлюбе з прывезенай з Мінскай губерніі дзяўчынай Аляксандрай Лукіной, якая напярэдадні Першай сусветнай вайны нарадзіла яму сына Міхаіла.

1 жніўня 1914 года пачынаецца Першая сусветная вайна, як афіцэр запасу, Сідар Іванавіч Паўлюкавец быў прызваны падчас мабілізацыі ў дзеючую армію. Вядома, што з 1915 года ён служыў у рэзервовым пяхотным палку, які дыслацыраваўся ў Лунінцы. Летам – восенню 1915 года, у сувязі з наступленнем кайзераўскіх войск, лінія фронта ўсталявалася крыху ўсходней Пінска, па Ясельдзе, Агінскаму каналу і ішла праз Лагішын да Баранавічаў і далей, тым самым, перарэзала ўсякія стасункі Паўлюкаўца са сваёй сям'ёй.

У выніку ён хваляваўся і перажываў за сям'ю, таму што не ведаў, дзе жонка з сынам, якому не было яшчэ і года, што з бацькамі. У гэтай сітуацыі Сідар Паўлюкавец шукаў магчымасці атрымаць больш канкрэтныя звесткі аб сваіх родных. І такая магчымасць з'явілася. Ведаючы, якую карысць прыносілі партызанскія дзеянні ў час вайны 1812 года, расійскае камандаванне ўсё больш схілялася да думкі разгарнуць шырокамаштабную партызанскую вайну на акупіраваных немцамі тэрыторыях. Арганізацыя партызанскай барацьбы і стварэнне партызанскіх атрадаў на беларускіх землях распачаліся з восені 1915 г. Ужо напрыканцы кастрычніка 1915 г. у наваколлі Пінска пачалі дзейнічаць першыя партызанскія групы. Аб іх дзейнасці вядомы генерал А.А. Брусілаў расказвае наступнае: "Выходзілі бясконцыя непаразуменні з мясцовымі жыхарамі, прычым, прызнаючы толькі асабіста Іванова (аўт. галоўнакамандуючы Паўднёва-Заходнім фронтам), гэтыя партызаны прычынялі безліч грабяжоў і мелі вельмі малую схільнасць ваяваць з ворагам. У апошнім я іх цалкам апраўдваў, бо на Пінскіх балотах рабіць конныя набегі было немагчыма, і яны нават калі б і хацелі весці конныя баі, усё роўна ні ў якім выпадку не змаглі б гэтага выканаць" [4, с. 173]. Што датычыцца грабяжу і рабаўніцтва, то сапраўды сустракаліся на Піншчыне такія выпадкі, аб якіх пазначана ў адным з дакладаў мінскаму губернатару ад пінскага ісправніка, дзе паведамляецца , што на прыфрантавой паласе "З крымінальных злачынстваў болей вядомых з'яўляецца выпадак забойства, з мэтай грабяжа, напрыканцы 1915 года невядомымі двумя казакамі-партызанамі мяшчан аколіцы Сернічкі - Пятра, Андрэя, Івана Палюховічаў і ранення ў галаву Карла Палюховіча" [5].

У сувязі з чым у лятучы партызанскі атрад, які базіраваўся ў Лунінцы, падбіралі найбольш вопытных, дысцыплініраваных і правераных байцоў. Такім чынам у зводны атрад пад агульным камандаваннем палкоўніка Андрэя Астраградскага і беларуса з Магілёўшчыны капітана Сцяпана Лявонцьева ўваходзілі прадстаўнікі з розных казачых і кавалерыйскіх дывізій, усяго 350 чалавек. Але ніхто з іх не ведаў тутэйшай цяжка-праходнай, балоцістай мясцовасці. Да таго ж карэнныя жыхары паляшукі, як правіла, адказваліся ісці на кантакт з расійскімі вайскоўцамі, якія к таму ж не маглі зразумець беларуска-палескай гаворкі. У гэтай сітуацыі Сідар Паўлюкавец і прапанаваў сваю дапамогу земляку Сцяпану Лявонцьеву, спадзяваючыся, што калі нават не зможа ўбачыць сваіх родных, дык хоць даведаецца аб іх лёсе падчас партызанскіх вылазак у блізляжачыя вёскі. Паўлюкавец быў залічаны намеснікам камандзіра ў тую групу зводнага атрада, якой кіраваў капітан Лявонцьеў. Менавіта гэтаму партызанскаму атраду стала вядома, дзякуючы апытанню ся-

лян пінскага павета, што ў фальварку Невель (26 км. паўднева-заходней Пінска) размешчаны штаб нямецкіх войск. Высланыя групы разведкі пацвердзілі гэтыя звесткі. Пасля чаго, на агульным савеце камандзірамі атрадаў было вырашана правесці раптоўную аперацыю супраць кайзераўскіх войск у Невелі. Аперацыю рыхтавалі вельмі старанна. 9 лістапада ў Невель і яго ваколіцы на чале з Сідарам Паўлюкаўцом былі высланы нарады разведкі. Разведка сабрала падрабязныя звесткі аб распалажэнні дазораў і застаў праціўніка, а таксама змагла даведацца аб колькасным складзе невельскага гарнізона. Акрамя таго, для вылазкі яшчэ неабходна было зрабіць пераправу праз раку Струмень, і Паўлюкавец змог дамовіцца аб гэтай дапамозе з мясцовымі жыхарамі. Вылазка пачалася познім вечарам з 14 на 15 лістапада 1915 года. Загадзя было размеркавана, якая група партызан, дзе будзе весці атаку, а таксама была выведзена ахоўная група, каб забяспечыць прыкрыццё падчас дамоўленага адыходу партызан. Па агульнай камандзе партызаны атакавалі ворага, закідаўшы ручнымі гранатамі хаты, дзе размяшчаліся кайзераўскія салдаты. Была дасягнута поўная нечаканасць нападу. Нямецкія салдаты выскаквалі з падпаленых хат, часта не паспеўшы нават прыхапіць зброю. Але адзін з кулямётчыкаў усё ж паласнуў чаргой па казаках. Лявонцьеў паваліўся на зямлю. Ён памёр праз некалькі хвілін, разам з ім загінулі яшчэ чацвёра байцоў, а адзінаццаць былі паранены. У гэтых абставінах камандванне группай атрада ўзяў на сябе Сідар Паўлюкавец. Ён даведаўся, дзе размяшчаецца штаб. А там адпаведна знаходзіліся каштоўныя дакументы і кватаравала начальства. Афіцэраў патрэбна было браць жывымі, але тыя, узрушаныя раптоўнасцю налёту, і самі здаваліся ў палон. Накінуўшы на бялізну генеральскую шынель з паднятымі рукамі, да партызанаў выйшаў камандзір дывізіі генерал-маёр – Зігфрыд Фабарыус, які вечарам 14 лістапада прыехаў у Невель для агляду пазіцый [6, с. 175]. Аперацыю па захопу гарнізона ў Невелі прызналі паспяховай, быў знішчаны амаль батальён ворага, пашкоджаны артылерыйскія гарматы. У рукі расійскага камандавання трапіла каштоўная аператыўная карта ўсяго ўчастка фронту і іншыя дакументы. Аб вялікай значнасці дадзенай аперацыі гаворыць той факт, што з абставінамі яе быў дабра азнаёмлены імператар Мікалай II, які ўзнагародзіў за аперацыю болей чым 300 партызан. 20 з іх атрымалі Георгіеўскія крыжы, у тым ліку і Сідар Паўлюкавец.

Будучы пад уплывам рэвалюцыйнай прапаганды бальшавікоў, С.І.Паўлюкавец з радасцю і надзеяй ўспрыняў вестку аб Кастрычніцкай рэвалюцыі, а затым гераічна змагаўся з ворагамі маладой Савецкай рэспублікі ў гады грамадзянскай вайны. Але ў гэты час працягвалася і Першая сусветная вайна. У тых мясцовасцях, дзе дзейнічалі партызанскія атрады, акупацыйныя кайзераўскія ўлады праводзілі карныя аперацыі, у ходзе  якіх спальвалі вёскі, здзекаваліся з дзяцей, старых, жанчын [7, с. 11]. Безумоўна, такая акупацыйная палітыка не магла не выклікаць супраціўлення. У кастрычніку 1918 г. пачалося Палескае паўстанне, цэнтрам якога стаў Пінскі павет. У канцы 1918 г. для агульнага кіраўніцтва паўстаннем у Століне быў створаны Палескі рэвалюцыйны ваенны камітэт (РВК) на чале з Р.М. Астроўскім. У гэты камітэт увайшоў і С.І. Паўлюкавец, задачай якога ў дадзеным органе прызначалася арганізацыя і стварэнне партызанскіх атрадаў на Піншчыне сярод мясцовага насельніцтва. Імкнучыся ўзяць пад сваю апеку партызанскі рух на Палессі, бальшавіцкія ўлады накіравалі сюды вядомага па дзеяннях 1915 г. камандзіра партызанскага атрада А.М. Ільіна. Ён меў значныя паўнамоцтвы, непасрэдна звязваўся па тэлеграфу з У. Леніным і Я. Свярдловым, у эпіцэнтр паўстання на станцыю Лунінец было выслана некалькі эшалонаў прабальшавіцкі настроеных войскаў. У выніку А. Ільін узначаліў агульнае кіраўніцтва ўсімі вайсковымі і паўстанцкімі сіламі ў заходнім палескім рэгіёне. Вядома, што ён абапіраўся ў сваёй дзейнасці на мясцовых жыхароў  Ф.А. Казубоўскага, Р.М. Астроўскага, С.І. Паўлюкаўца і іншых. Паўстанцы Палесся выдавалі сваю партызанскую газету пад назвай “Лесное эхо” [8, с. 206]. Прамыя нашчадкі С. Паўлюкаўца ўспамінаюць, што ў 1919 г. ён вярнуўся ў родную вёску Махро і нейкі час жыў з сям’ёй. Аднак затым зноў быў заклікаsuccessfully на франты грамадзянскай вайны, канец якой правёў на Каўказе. Вядома, што на працягу сваёй вайсковай службы ён быў 9 разоў паранены [3, с. 100]. Пасля апошняга ранення лячыўся ў горадзе Пяцігорску, дзе і застаўся. Яму вельмі хацелася вярнуцца ў родныя мясціны, але ён не мог. Пасля падпісання Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. Заходняя Беларусь увайшла ў склад Польшчы. Сідар Паўлюкавец балюча перажываў разлуку з роднымі, з сям’ёй, якія аказаліся пад Польшчай.

Напрыканцы 1934 г. Сідара Іванавіча Паўлюкаўца не стала. Пахаваны ён быў у падножжа гары Машук [3, с. 100].

Падобна на тое, што Каўказ так і не змог замяніць беларусу роднага Палесся. У яго роднай старонцы вёсцы Махро памятаюць і шануюць свайго славутага земляка Сідара Іванавіча Паўлюкаўца. Партызаны Вялікай Айчыннай вайны называлі яго сваім настаўнікам, таму што менавіта Паўлюкавец даў ім першыя азы, як непрыкметна хадзіць па тайных балотных сцяжынках, навучыў пра-

мудрасцям і хітрасцям разведкі. Сёння на радзіме Паўлюкаўца дзейнічае краязнаўчы музей, у якім захоўваецца памяць аб легендарным зямляку, некаторыя матэрыялы аб ім таксама ёсць ў школьным музеі вёскі Махро.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Игнатьев, А.А. 50 лет в строю. Воспоминания / А.А. Игнатьев. – Москва : Изд. Захаров, 2002. – 540 с.

2. Всемирная история. Эпоха мировых войн /А.Н. Бадак, И.Е. Войнич, Н.М. Волчек и др. – Минск : Харвест, 2007. – 1440 с.

3. Памяць : Гіст. – дакум. Хроніка Іванаўскага р-на. – Мінск. : БЕЛТА, 2000. – 592 с.

4. Брусилов, А.А. Мои воспоминания / А.А. Брусилов. – М., 1983. – 225 с.

5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 9148. – Л. 20.

6. Bierwagen, Max. Zwischen Somme und Pripjet . Geschichte des Reserve-Infanterie-Regiments Nr 271, im Weltkriege 1914 bis 1918. Erster Teil: Von der Gründung des Regiments bis zum März 1917, Max Bierwagen. – Breslau, 1927. – 205c.

7. Цуба, М.В. Партызанскі рух на беларускіх землях у гады Першай сусветнай вайны / М.В.Цуба // Беларускі гістарычны часопіс. – 2010. – №8. – С. 9-12.

8. Цуба, М.В. Першая сусветная вайна на Беларусі ў кантэксце сусветных ваенных падзей (грамадскі і ваенны бакі) 1914 – 1918 гг.: Манаграфія / М.В. Цуба. – Пінск : ПалесДУ, 2010. – 304 с.


Рэпазіторый ПолесГУ